**ГЎТАРКА**, мастацка-публіцыстычны твор (часцей ананімны), у якім ставяцца актуальныя пытанні нар. жыцця ці грамадскай маралі; спецыфічны жанр бел. л-ры 19 ст. Звычайна гэта празаічны ці вершаваны маналог або дыялог, у якім у форме насмешлівай доказнай гаворкі асвятляліся вострыя сац.-паліт. (*«Гутарка Данілы са Сцяпанам»*) і маральныя (*«Гутарка Паўлюка»*) праблемы. Першапачаткова Г. была неад'емнай часткай сялянскага эпасу, мела пераважна будзённы змест (*«Гутарка ў карчме, спісаная Кандрусём з-пад Докшыц»*). Вершаваная Г. пісалася сілабічным, інтанацыйна-сказавым, сілаба-танічным вершам. У ёй панавала жывое, эмацыянальнае, надзвычай вобразнае, багатае на прыказкі і прымаўкі нар. маўленне. У 1840-я гг. бел. Г. аказала значны ўплыў на польскамоўную маст. л-ру Беларусі. Адным з першых спакойна-эпічны лад гэтага жанру пераняў У.Сыракомля («Паштальён», «Хадыка», «Улас»). У 1860-я гг. Г., не страчваючы сувязі з фальклорам, набыла выразны паліт. змест, выкарыстоўвалася рэвалюцыянерамі як сродак антыпрыгонніцкай і антыцарскай агітацыі (*«Гутарка старога дзеда»*, *«Гутарка двух суседаў»*). Бел. сялянская Г. надзвычай блізкая да польск. шляхецкай гавэнды («Успаміны Сапліцы» Г.Жавускага). Яны аднолькава патрабуюць зацікаўленага слухача, які падзяляе пагляды аратара на жыццё і яго з'явы, карыстаюцца не літ., а гутарковай мовай. «Гутарковаму» стылю адпавядалі першыя беларускамоўныя творы «Быліцы. Расказы Навума», «Вечарніцы» В.Дуніна-Марцінкевіча, апавяданні «Сведка», «Дзядзіна» і некаторыя эпічныя вершы Ф.Багушэвіча. Эпічны лад бел. Г. быў выкарыстаны А.Міцкевічам у баладзе «Папас ва Упіцэ». *В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова